**Півавар М. В.**

# НОВЫЯ ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ Ў ВІЦЕБСКІМ РАЁНЕ

***Ключавыя словы:*** помнік гісторыі, помнік культуры, Віцебскі раён.

У Віцебскім раёне як помнікі архітэктуры ахоўваюцца дзяржавай сядзібны дом маёнтка “Мілае” ў Мазалава (1804), паштовая станцыя ў в. Бараўляны (1843), будынак Землябробчай школы (1909) і Узнясенскай царквы (1908) у Лужасна.

Статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці не маюць, але вядомы: былая Крыжаўзвіжанская царква ў Лужасна (1815), сядзіба У. Адамава ў в. Вялікія Лётцы (кан XIX ст.), сядзіба Астрэйкаў у в. Лукі (пач. XX ст, але моцна пашкоджаны пажарам 200_ г.), гаспадарчыя пабудовы сядзібы Магучых у в. Падбярэззі (кан. XIX ст.).

Апошнімі даследаваннямі выяўлена яшчэ некалькі цікавых помнікаў архітэктуры ў раёне.

1. Мураваная капліца на могілках у в. Будзянка (кан. XIX – пач. XX ст). Капліца знаходзіцца ў 0,4 км на поўдзень ад вёскі, на грамадзянскіх могілках. Узведзена ў кан. XIX – пач. XX ст. верагодна панамі Вайцяхоўскімі. Збудавана з чырвонай цэглы. Планіроўка квадратная. Памеры 3 на 3 м. Адзін з вуглоў будынка зрэзаны і ў ім утвораны уваход. Захаваўся металічны дрок, якім ён быў абкладзены. На ўзроўні 1,5 м. ад зямлі з кожнага боку ў сценах у нішах зроблены невялікія вузкія вокны памерамі 90 х 45 см. Уверсе яны маюць закругленыя зводы на ўзор раманскага стылю. На вокнах меліся металічныя рамы. Па баках ад вакон нішы ўтвораны нішы памерамі 25 х 40 см, якія паўтараюць форму акон. На даху меўся купал, які на наш час страчаны. Капліца была ў добрым стане да 1970-х гг. У сутарэннях знайшлі снарады часоў вайны. Сапёры правялі размініраванне, але пашкодзілі будынак. На наш час добра захаваліся толькі сцены, адна з іх нахілілася. Даху няма. Стан не здавальняючы.

2. Будынак павятовай бальніцы ў в. Курына (пач. XX ст.). будынак былой бальніцы ў в. **Курына**. Аднапавярховы Г-падобны ў плане будынак пад вальмавым дахам. Кожны з крылаў мае асобныя ўваходы. Да правага крыла прымыкае квадратная ў плане частка з асобным уваходам. Гэтая частка будынка мае большы высокі вальмавы дах. У выступ, утвораны паміж Г-падобнай часткай і квадратнай прыбудаваны падобныя памяшканні. Фасады плоскія, выведзены з чырвонай цэглы. Па вуглах пілястры, карніз па перыметру, вокны і праёмы дзвярэй лучковыя з сціплымі ліштвамі характэрнымі для эпохі мадэрну.

Будынак гарманічны, вытрыманы ў адным стылі, мае выразныя элементы архітэктуры функцыяналізму канца XIX – пач. XX ст. Хутчэй

за ўсё яго часткі пабудаваны ў адзін час, без пазнейшых прыбудоў. Па словах мясцовых жыхароў была павятовай бальніцай. З 2020 г. не выкарыстоўваецца.

3. Каменны гаспадарчы будынак у Ноўцы (пач. XX ст.). Знаходзіцца каля шашы. Узведзены з цэглы. Па вуглах упрыгожаны квадратнымі выступаючымі элементамі па 4 цагліны. Усяго 7 выступаў на кожным вуглу. Пад дахам выкладзены карніз. Сцены глухія, на адной каля вузкай і высокай дзвяры закратаванае вакно. Аўтэнтычны дах страчаны, цяпер пакрыты шыферам. На сцяне надпіс фарбай "Хлебороб! Любі землю – главный источник богатства, силы и славы нашей Родины".

4. Гаспадарчы будынак пры вадзяным млыне, узведзены з чырвонай цэглы захаваўся ў Мазалава.

5. Знойдзены яшчэ адзін помнік дорожна-тэхнічнай архітэктуры – кавалак дарогі пакрытай каменным брукам – брукаванка. Такі вядомы ў в. Вялікія Лётцы, а цяпер выяўлены ў в. Цяцёркі. Некалькі частак брукаванкі цяпер засыпаны пяском – каля Храпальна, Шчучына.

Дзякуючы працы краязнаўцаў удалося выявіць цікавыя здымкі, якія праліваюць святло на некаторыя старонкі нашай мінуўшчыны. У газеце "Зара Запада" за 1 верасня 1929 года змешана фатаграфія сядзібнага дома ў Брыгіполлі. З дугога здымка мы ведаем, як выглядала сядзіба ў генерала Андрыянава ў Старым Сяле. Міжваенны здымак школы ў Мазалава вырашыў пытанне, ці быў балкон на другім паверсе панскага дома Манькоўскіх, ці не? Для іншага такія факты могуць паказацца дробязямі, але ўлічваючы, што сядзіб у нас на пачатак XX ст. было некалькі соцень, а захаваліся толькі адзінкі, і, як выглядалі яны, мы не ведаем, то такія фотаздымкі каштоўны. З такіх "драбніц" складваецца гісторыя.

**Раемский Ю. А.**

## СТАВКА ВЕРХОВНОГО ГЛАВНОКОМАНДУЮЩЕГО В МОГИЛЕВЕ (1915–1917 ГГ.): ПЕРСПЕКТИВЫ ИЗУЧЕНИЯ ВОЕННОГО НАСЛЕДИЯ И ЕГО ТУРИСТИЧЕСКИЙ ПОТЕНЦИАЛ

***Ключевые слова***: Могилев, Ставка Верховного главнокомандующего, император Николай II.

С началом Первой мировой войны Ставка Верховного главнокомандующего действующей армией и флотом Российской империи разместилась недалеко от станции Барановичи-Полесские, на территории соснового леса, где ранее располагалась железнодорожная бригада. Неоднократно сюда приезжал император Николай II, но пробыл